**ЗАКЛЮЧЭННЕ**
савета па абароне дысертацый Д 02.03.01 пры МДУ імя А. А. Куляшова
па дысертацыі Гаршкова Аляксандра Дзмітрыевіча
"Культура броме ў міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана:
засяленне, храналогія, матэрыяльная культура",
прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.06 – археалогія

**Спецыяльнасць і галіна навукі, па якой прысуджаецца вучоная ступень.**

Дысертацыя А. Д. Гаршкова адпавядае спецыяльнасці 07.00.06 – археалогія (гістарычныя навукі).

**Навуковы ўклад саіскальніка ў вырашэнне навуковай задачы з ацэнкай яго значнасці.**

Даказана існаванне культуры броме на тэрыторыі Беларусі ў міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана, вызначана тапаграфія, планіграфія і стратыграфія помнікаў культуры броме, раскрыты асаблівасці ўзаемадзеяння насельніцтва гэтай культуры з навакольным асяроддзем і ахарактарызавана іх гаспадарчая дзейнасць, вызначана храналогія і месца помнікаў культуры броме ў фінальным палеаліце Беларусі і сумежных тэрыторый. Упершыню ў айчыннай археалогіі пры вывучэнні помнікаў фінальнага палеаліту выкарыстоўваўся шырокі спектр прыродазнаўчых і геаінфармацыйных метадаў даследавання (грануламетрычны аналіз літалагічных напластаванняў, метады матэматычнай карэляцыі колькасных паказчыкаў, аналіз карт рэльефу STRM).

**Навуковыя вынікі, за якія прысуджана вучоная ступень:**

– выяўленне прычын міграцыі носьбітаў культуры броме ў міжрэчча Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана (наяўнасць крамянёвай сыравіны для вырабу прыладаў працы і папуляцыі паўночнага аленя – асноўнага аб'екта палявання);

– распрацоўку крытэрыяў уладкавання стаянак на засвоенай тэрыторыі ў залежнасці ад функцыянальнай прыналежнасці і адаптацыі насельніцтва да мясцовых прыродна-кліматычных умоў, вызначэнне структуры паселішчаў і іх гаспадарчай спецыялізацыі: паселішчы-майстэрні ў месцах упадзення малой ракі ў вялікую або вусцяў яроў і лагчын (басейн р. Нёман) і стаянкі на марэнных узвышшах і пагорках побач з вадаёмамі (басейны р. Прыпяць і р. Заходні Буг), на якіх выяўлены рэшткі жытла, вогнішча, месцы апрацоўкі сыравіны і вырабу крамянёвых прыладаў працы, месцы ўтылізацыі прадуктаў гаспадарчай дзейнасці, месцы ўтылізацыі адыходаў (ямы-сметніцы);

– характарыстыку матэрыяльнай культуры насельніцтва броме Заходнебугска-Прыпяцка-Нёманскага міжрэчча на падставе тэхніка-марфалагічнага аналізу каменнага (крамянёвага) інвентару з мясцовай сыравіны, доказ яго ідэнтычнасці з калекцыямі з помнікаў асноўнага арэала распаўсюджвання культуры броме;

– вызначэнне храналогіі культуры броме (канец алерода – дрыяс III) і яе ўплыву на фарміраванне арэнсбургскай, валкушанскай (краснасельскай) і падольскай археалагічных культур.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні вынікаў даследавання.**

Высновы і вынікі дысертацыйнага даследавання маюць практычнае значэнне для органаў мясцовага кіравання пры планаванні і правядзенні мерапрыемстваў па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры. Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы вучэбных дапаможнікаў для ўстаноў агульнай сярэдняй і вышэйшай адукацыі, пры распрацоўцы лекцый і спецкурсаў па археалогіі і гісторыі Беларусі, Усходняй Еўропы ў вышэйшых навучальных установах, навукова-асветніцкай дзейнасці ў музеязнаўстве і турызме, пры стварэнні новых экспазіцый і распрацоўцы турыстычных маршрутаў у Рэспубліцы Беларусь.

Старшыня савета
па абароне дысертацый Д 02.03.01 Д. У. Дук

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый Д 02.03.01 А. С. Мельнікава

04.06.2024